# НА ВУЧОБУ ЗАПРАШАЕ ГОМЕЛЬСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

*СПЕЦВЫПУСК ГАЗЕТЫ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ*

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

№ 18 (257) | Субота, 21 мая 1977 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.



НА ЗДЫМКУ: галоўны корпус Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

# ХАЙ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА ВАШЫ МАРЫ

**Б. В. БОКУЦЬ,**
**рэктар універсітэта, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН БССР**

Мы жывём у эпоху, калі навукова-тэхнічная рэвалюцыя, паскоранае будаўніцтва камуністычнага грамадства ўсё ў большай колькасці патрабуюць спецыялістаў высокай кваліфікацыі. На гэтай аснове XXV з'езд КПСС вызначыў перад ВНУ краіны новыя, адказныя задачы па падрыхтоўцы маладых кадраў для ўсіх галін народнай гаспадаркі. Іх вырашэнне прадугледжвае карэннае ўдасканальванне ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу вышэйшай школы, яго ўсямернага збліжэння з практычным жыццём. Як і належыць, у гэтай справе вядучая роля адводзіцца ўніверсітэтам.

Прафесарска-выкладчыцкі састаў і грамадскія арганізацыі ГДУ накіроўваюць свае намаганні на паспяховае выкананне гістарычных рашэнняў партыйнага з'езда. Намі ўзяты курс на няўхільнае павышэнне якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў з тым, каб набытым ведам яны змаглі знайсці самае шырокае і плённае прымяненне. Перш за ўсё мы імкнемся забяспечыць кадрамі прадпрыемствы і арганізацыі Гомеля, вобласці і сваёй рэспублікі. Падрыхтоўка спецыялістаў ажыццяўляецца з такім разлікам, каб многія з іх, атрымаўшы дыплом аб вышэйшай адукацыі, актыўна ўключыліся ў вывучэнне і асваенне багатых рэсурсаў беларускага Палесся.

Неабходна адзначыць, што сёлета колькасць выпускнікоў універсітэта, якія пры размеркаванні атрымалі накіраванні ў вытворчую сферу, намнога большая, чым ва ўсе папярэднія гады. Гэта вынік усё мацнеючых сувязей паміж ГДУ і прадпрыемствамі, асабліва гомельскімі, характэрны паказчык творчага супрацоўніцтва калектыву ўніверсітэта з шэрагам буйных заводаў і аб'яднанняў. У даным напрамку найбольшых поспехаў дасягнуў фізічны факультэт, падрабязна пра які, як і пра ўсе іншыя, можна даведацца з выступлення дэкана ў сённяшнім нумары ўніверсітэцкай шматтыражкі.

Наш універсітэт — адзін з самых маладых у краіне. Яго дзесяцігадовы юбілей мы будзем адзначаць праз два гады. Але ўжо і за гэты, параўнаўча кароткі час ГДУ ператварыўся ў буйную кузню па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, стаў вядучай навучальнай і навуковай установай Поўдня Беларусі. Гэта з'яўляецца яскравым сведчаннем вялікіх клопатаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб развіцці ў краіне вышэйшай школы. Умовы для вучэбна-выхаваўчай работы ў нашым універсітэце з кожным годам паляпшаюцца. Для лабараторый усіх чатырох вучэбных карпусоў штогод набываецца на сотні тысяч рублёў самага дасканалага абсталявання, найноўшых прыбораў. У галоўным корпусе ўніверсітэта дзейнічае навукова-вучэбная вылічальная лабараторыя, дзе ўстаноўлена ЭВМ «Мінск-32». У вучэбным корпусе № 2 створаны студэнцкі вылічальны цэнтр, аснашчаны вылічальнымі машынамі «Мір-1» і «Мір-2». У перспектыве прадугледжваецца набыць і ўстанавіць яшчэ адну электронна-вылічальную машыну навейшага пакалення.

Нашы студэнты, якія маюць найбольш вострую патрэбу ў жыллі, забяспечаны інтэрнатамі. У недалёкім часе пачнецца будаўніцтва яшчэ аднаго — чацвёртага па ліку — шматпавярховага інтэрната на 650 месц. З уводам яго ў эксплуатацыю жыллёвая праблема вырашыцца яшчэ ў большай ступені.

Наш універсітэт мае бібліятэку з адным з самым багатых у горадзе кніжных фондаў, які штогод папаўняецца на 40 і больш тысяч экземпляраў разнастайнай літаратуры, сталоўку і буфеты, санаторый-прафілакторый, дзе за год умацоўвае сваё здароўе прыкладна па 900 студэнтаў, выдатныя спартыўныя залы, стадыён і многае іншае, што неабходна для выдатнай вучобы і гарманічнага развіцця студэнцкай моладзі.

Нельга не сказаць пра тое, што ў бягучай пяцігодцы пачнецца будаўніцтва ў Гомелі новага ўніверсітэцкага гарадка, распрацаваны праект якога як узорны дэманструецца на міжнароднай выстаўцы ў Дэлі. Таму сёння з поўным правам можна канстатаваць, што прыйдзе час, калі для вучобы ў ГДУ створацца найлепшыя ўмовы.

Зусім хутка з універсітэтам развітаюцца 810 яго выпускнікоў. Праўда, некаторыя з іх пакінуты на кафедрах, у лабараторыях, будуць працягваць вучобу ў аспірантуры. На месца маладых спецыялістаў прадугледжваецца набраць 800 першакурснікаў. Прыйдзе новае папаўненне на вячэрняе аддзяленне і завочны факультэт. Увесь кантынгент студэнтаў разам са слухачамі падрыхтоўчага аддзялення значна перавысіць сем тысяч чалавек. Свае веды ім шчодра будуць аддаваць больш 460 выкладчыкаў, сярод якіх на сённяшні дзень — 18 дактароў навук, прафесараў і звыш 150 кандыдатаў навук, дацэнтаў, працуючых на 38 кафедрах. Яны вядуць падрыхтоўку спецыялістаў па 10 спецыяльнасцях і 26 спецыялізацыях.

Той, хто сёлета паступіць да нас на вучобу, зможа з цягам часу выбраць для сябе цяпер яшчэ і не існуючую ва ўніверсітэце спецыялізацыю, таму што мы ўсебакова вывучаем і абгрунтоўваем мэтазгоднасць адкрыцця не толькі новых спецыялізацый, але і спецыяльнасцей.

Студэнты ўніверсітэта не абмяжоўваюцца толькі вучобай. У вольны час кожны з іх можа выбраць для сябе занятак па душы. Адны студэнты ўдасканальваюць сваё спартыўнае майстэрства, другія — займаюцца ў гуртках мастацкай самадзейнасці, трэція — перыядычна на пасяджэннях літаратурнага аб'яднання «Крыніцы» абмяркоўваюць свае творы, з якімі затым выступаюць на старонках перыядычнага друку, па абласному тэлебачанню, перад шматлікімі аматарамі паэзіі і літаратуры ў школах і моладдзю горада і г. д. Шмат яшчэ чаго цікавага ёсць у нашым універсітэце. У адным артыкуле пра ўсё не раскажаш. Мне ж хочацца спыніцца на тым, без чаго сёння нельга ўявіць сучаснага студэнта. Маю на ўвазе студэнцкія будаўнічыя атрады. Яны сталі выдатнай школай фізічнай загартоўкі і працоўнага выхавання моладзі. Прыемна адзначыць, што ў кожным працоўным семестры нашы студэнты дабіваюцца ўсё большых паказчыкаў, пацвярджаючы, што ім заслужана ў ліку першых у рэспубліцы за высокія дасягненні ў будаўніцтве, меліярацыі зямель, поспехі ў вучобе і грамадскай рабоце прысуджаны памятны Чырвоны сцяг ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР.

Прысвячаючы сённяшні нумар універсітэцкай шматтыражкі вам, паважаныя абітурыенты, мы спадзяемся, што вы з матэрыялаў газеты ў дастатковай меры даведаецеся пра факультэты ГДУ, існуючыя ў нас спецыяльнасці і спецыялізацыі і многае іншае, што можа зацікавіць, выклікаць жаданне вучыцца ў вядучай вышэйшай навучальнай установе беларускага Палесся — выдатным горадзе над Сожам.

Мы рады вітаць абітурыентаў юбілейнага для Савецкай краіны года. Мы горача жадаем поспеху на ўступных конкурсных экзаменах самым падрыхтаваным і дастойным вучыцца ў ГДУ!

# ВЫЛУЧАНЫ ДАСТОЙНЫЯ

17 мая актавую залу запоўнілі студэнты і выкладчыкі ўніверсітэта. Тут адбыўся сход па вылучэнню кандыдата ў дэпутаты Гомельскага абласнога Савета па Фурманаўскай выбарчай акрузе № 16.

На сходзе выступіў сакратар камсамольскай арганізацыі эканамічнага факультэта Анатоль Сенін. Ён прапанаваў вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Савета дэпутатаў працоўных студэнтку 2-га курса аддзялення арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі эканамічнага факультэта Людмілу Канстанцінаўну Краснагір і ахарактарызаваў яе як выдатніцу вучобы, старанную актывістку.

Унесеную прапанову падтрымалі дэкан эканамічнага факультэта І. П. Трацэўскі і куратар групы 0-21, членам якой з'яўляецца Л. К. Краснагір, выкладчык У. П. Піскун.

Сход аднадушна прыняў рашэнне вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Савета па Фурманаўскай выбарчай акрузе № 16 **Людмілу Канстанцінаўну Краснагір.**

18 мая ў актавай зале ўніверсітэта адбыўся перадвыбарны сход калектыву ГДУ па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Гомельскага гарадскога і Цэнтральнага раённага Саветаў. Выступіўшыя на сходзе выкладчыкі і студэнты назвалі і падтрымалі для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты гарадскога Савета: па выбарчай акрузе № 203—прарэктара ГДУ па вучэбнай рабоце, прафесара **Леаніда Аляксандравіча Шамяткова,** па выбарчай акрузе № 204 — студэнтку 3-га курса аддзялення беларускай і рускай моў і літаратур гісторыка-філалагічнага факультэта **Антаніну Дзмітраўну Бараноўскую,** па выбарчай акрузе № 205 — былога выпускніка біялагічнага факультэта, а цяпер намесніка старшыні гарвыканкома **Міхаіла Іванавіча Скрыннікава,** па выбарчай акрузе № 206 — студэнта 3-га курса гістарычнага аддзялення гісторыка-філалагічнага факультэта **Пятра Пятровіча Чындарова;** у Цэнтральны раённы Савет: па выбарчай акрузе № 76 —былога выкладчыка кафедры філасофіі ўніверсітэта, загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Цэнтральнага райкома КПБ Мікалая Аляксандравіча Казловіча, па выбарчай акрузе № 152 — загадчыка кафедры эканомікі працы дацэнта **Уладзіміра Дзянісавіча Арэшчанку,** па выбарчай акрузе № 153 — студэнта 3-га курса эканамічнага факультэта **Генадзя Анатольевіча Ліскова.**

На перадвыбарных сходах абраны даверaныя асобы вылучаных кандыдатаў у мясцовыя Саветы ад калектыву ГДУ.

# АГУЛЬНАЎНІВЕРСІТЭЦКІ ПАРТЫЙНЫ СХОД

18 мая ў актавай зале адбыўся адкрыты агульнаўніверсітэцкі партыйны сход. Абмеркавана пытанне «Аб задачах партарганізацыі па выкананню пастановы бюро Гомельскага гаркома КПБ «Аб рабоце рэктарата і парткома ГДУ па ідэйна-маральнаму выхаванню прафесарска - выкладчыцкага саставу і студэнтаў у святле патрабаванняў XXV з'езда КПСС». З дакладам выступіў сакратар парткома **У. В. Казлоў.**

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел: дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта **Т. І. Язэпава,** сакратар партбюро механіка-матэматычнага факультэта **В. П. Стаўроў,** старшы выкладчык кафедры палітэканоміі, кіраўнік тэарэтычнага семінара выкладчыкаў эканамічнага факультэта **У. Ц. Смірноў,** сакратар партбюро геалагічнага факультэта **Ж. А. Герасімава,** старшыня мясцкома **А. В. Саннікава,** сакратар партбюро факультэта фізічнага выхавання **Р. І. Трафімовіч,** сакратар камсамольскай арганізацыі біялагічнага факультэта **Людміла Сёмкіна,** прарэктар па завочнаму і вячэрняму навучанню **А. І. Балтоўскі,** дацэнт кафедры грамадзянскай абароны **Л. А. Нікалаеў.**

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.

У рабоце агульнаўніверсітэцкага партыйнага сходу, справаздача аб якім будзе змешчана ў наступным нумары нашай газеты, прынялі ўдзел загадчык аддзела прапаганды і агітацыі гаркома КПБ **У. І. Андрыевіч** і інструктар аддзела прапаганды і агітацыі Цэнтральнага райкома КПБ **Г. А. Казлоўская.**

